**Дыферэнцыраваныя заданні**
**па вучэбным прадмеце “Беларуская мова”, V – VII клас**

Дзямідзік Аксана Аляксандраўна,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры,
дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Старадварэцкі навучальна-педагагічны комплекс
яслі-сад-базавая школа”,
Бераставіцкі раён, Гродзенская вобласць
першая кваліфікацыйная катэгорыя,
e-mail: oksana43294@gmail.com

## V КЛАС

## ЛЕКСІКА. ФРАЗЕАЛОГІЯ

## АНТОНІМЫ

ГРУПА А

**Выберыце пары антонімаў**

Смелы – грубы, Радзіма – Айчына, сквапны – шчодры, злы – добры, цёплы – халодны, павітацца – развітацца.

ГРУПА В

**Адгадайце загадкі. Запішыце загадкі разам з адгадкамі па памяці. Падкрэсліце ў запісаных сказах антонімы**

Дзяжа чорная, а века белае. Стары і малы падымае, а цераз плот не перакіне. Летам апранаюцца, зімой распранаюцца. Усім, хто прыходзіць, усім, хто выходзіць, яна руку падае. Стане – вышэй каня, ляжа – ніжэй ката.



ГРУПА С

**Па малюнку складзіце сказы, выкарыстоўваючы антонімы.**

Для даведкі: холад – цяпло, вечар – раніца, сонечны – пахмурны, старэйшы – малодшы, адлятаць – прылятаць, маўчаць – спяваць.

**Як выкарыстанне слоў з супрацьлеглым значэннем дапамагае перадаць думкі?**

**Да якіх часцін мовы адносяцца прыведзеныя пары слоў?**

## VI КЛАС

## ПОКЛІЧ МІНУЛЫХ ГАДОЎ

## УЛАДЗІМІР БУТРАМЕЕЎ.
## СЛАВУТАЯ ДАЧКА ПОЛАЦКАЙ ЗЯМЛІ

ГРУПА А

**1. Праслухайце ўрывак з паэмы А.Случаніна “Рагнеда”. Карыстаючыся памяткай, растлумачце назву твора.**

Памятка

Назва твора заключае ў сабе кароткую фармуліроўку яго ідэі.
Назва твора ўздзейнічае на эмацыянальны стан чалавека.
Назва твора абазначае адносіны аўтара да героя.
Назва твора абазначае галоўную дзеючую асобу.
Назва твора абазначае нейкую падзею.
Назва твора інфарміруе аб яго жанры.
Назва твора ўказвае на месца дзеяння.
Назва твора адлюстроўвае час яго дзеяння.

**2. Супастаўце гэтую назву з назвай урыўка У.Бутрамеева “Славутая дачка Полацкай зямлі”.**

Якая з назваў вам больш падабаецца і чаму? Ці можна і першы твор назваць “Славутая дачка Полацкай зямлі”?

ГРУПА В

1. Перакажыце блізка да тэксту кульмінацыйныя эпізоды твора, якія сведчаць аб найвышэйшым моманце ў развіцці дзеяння.
2. Падабярыце з Інтэрнэта карцінкі, якія адпавядаюць заканчэнню дзеяння. Раскажыце, што асабліва ўразіла ў заключных эпізодах твора.
3. Складзіце пытанні для Уладзіміра ад імя журналіста.

ГРУПА С

**1. Супастаўце рысы характару Рагнеды з эпізодамі з твора Л. Случаніна і У. Бутрамеева.**

Узор разважанняў:

| Рысы характару Рагнеды | Прыклады з тэкстаў |
|---|---|
| Вольналюбівая | “Навучыла жыццё волю светлую піць” |
| Гордая, непахісная | “Ніколі не знацца з прымусам…” |

2. **Падрыхтуйце сачыненне-апісанне Рагнеды па рэпрадукцыі карціны Аляксея Марачкіна “Рагнеда”, размешчанай на форзацы падручніка. Папярэдне адкажыце на пытанні, расшыфроўка якіх і дапаможа вам у выкананні задання:**

1. Які момант жыцця Рагнеды адлюстраваны на рэпрадукцыі карціны А.Марачкіна?
2. Як апранута Рагнеда?
3. Што, на вашу думку, самае галоўнае ў знешнім абліччы гераіні?
4. Якія дэталі знешняга вобліку Рагнеды і інтэр’ера карціны дапамаглі мастаку стварыць вобраз, блізкі да літаратурнага?
5. Як вы думаеце, што было галоўным для мастака, які ўзяўся за асэнсаванне складанай гістарычнай тэмы: данесці да нас горды і непахісны свабодалюбівы характар Рагнеды ці найперш яе духоўную моц, пачуццё ўласнай годнасці ва ўзаемаадносінах з князем Уладзімірам?

## VII КЛАС

## ЗЛУЧНІК

## ЗЛУЧАЛЬНЫЯ ЗЛУЧНІКІ

### ГРУПА А

**Прачытайце. Спішыце тэкст. Над спалучальнымі злучнікамі напішыце сп, над супраціўнымі – с, над размеркавальнымі – р.**

Прырода надзіва праўдзіва –
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет нас яна нарадзіла,
А мы забіваем яе.
То шротам, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом…
Планету мы так прапалолі:
Патомкі заплацяць жыццём.
Альбо выпрамляем машынай
Рачулкі, што любяць пятляць.
І сохне цяністы ляшчыннік,
І мяккія сцежкі пыляць.

ГРУПА В

**Прачытайце. Назавіце моўныя сродкі. Спішыце тэксты. Над спалучальнымі злучнікамі напішыце сп, над супраціўнымі – с, над размеркавальнымі – р.**

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. У якім значэнні ўжыты злучнік ды?

Гатоў ізноў ісці на мукі,
І замярзаць, і галадаць,
Каб нашым дзецям і ўнукам
Не бомбы ў спадчыну аддаць.
А Радзіму, ды чыстыя ліўні,
Ды зялёнае сонца лесу,
Ды блакітнае сонца мора,
Ды янтарнае сонца жыта.
Прырода надзіва праўдзіва –
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет нас яна нарадзіла,
А мы забіваем яе.
То шротам, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом…
Планету мы так прапалолі:
Патомкі заплацяць жыццём.
Альбо выпрамляем машынай
Рачулкі, што любяць пятляць.
І сохне цяністы ляшчыннік,
І мяккія сцежкі пыляць.

ГРУПА С

**Прачытайце. Назавіце моўныя сродкі. Спішыце тэксты. Над спалучальнымі злучнікамі напішыце сп, над супраціўнымі – с, над размеркавальнымі – р.**

**Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку. У якім значэнні ўжыты злучнік ды?**

**Складзіце і запішыце сказы (або невялікі тэкст), у якіх злучнікі паўтараюцца некалькі разоў з мэтай узмацнення выразнасці выказвання.**

Гатоў ізноў ісці на мукі,
І замярзаць, і галадаць,
Каб нашым дзецям і ўнукам
Не бомбы ў спадчыну аддаць.
А Радзіму, ды чыстыя ліўні,
Ды зялёнае сонца лесу,
Ды блакітнае сонца мора,
Ды янтарнае сонца жыта.

Прырода надзіва праўдзіва –
Ці вые, ці хмельна пяе.
На свет нас яна нарадзіла,
А мы забіваем яе.
То шротам, то вострай пілою,
То труцім, то палім жыўцом…
Планету мы так прапалолі:
Патомкі заплацяць жыццём.
Альбо выпрамляем машынай
Рачулкі, што любяць пятляць.
І сохне цяністы ляшчыннік,
І мяккія сцежкі пыляць.